Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 02/11/2026 15:06:37

DOI:10.17951/sb.2015.9.295
Studia Białorutenistyczne 9/2015 Językoznawstwo

Вікторыя Уласевіч

Narodowa Akademia Nauk Białorusi (Mińsk, Białoruś)
National Academy of Sciences of Belarus (Minsk, Belarus)

E-mail: ulasevich_v@mail.ru

Новыя і актуалізаваныя запазычанні з польскай мовы ў беларускай мове пачатку XXI ст. і іх адлюстраванне ў лексікаграфічных выданнях

Nowe i aktualizowane zapożyczenia z języka polskiego w języku białoruskim na początku XXI wieku i ich odzwierciedlenie w opracowaniach leksykograficznych

New and Actualized Borrowings from the Polish Language in the Belarusian Language in the Beginning of the 21st Century and Their Reflection in Lexicographical Works

Лексічныя працэсы ў беларускай мове канца XX – пачатку XXI стст. пад уплывам шэрага паза- і ўнутрымоўных фактараў маюць некаторыя спецыфічныя рысы. Гэты час характарызуецца значнымі зменамі ў грамадскім жыцці, якія паўплывалі на развіццё і функцыянаванне мовы, таму гэты перыяд можна вызначыць як своеасаблівы этап у развіцці беларускай мовы.

Аб'ектыўныя патрабаванні развіцця і ўдасканалення мовы і рознае суб'ектыўнае разуменне шляхоў, па якіх будзе ісці далейшае развіццё беларускай мовы, прывялі да таго, што ў беларускім грамадстве склаліся дзве плыні: „рэфарматарская" („радыкальная") і „традыцыяналісцкая" („кансерватыўная")[1]. „Рэфарматары" лічаць патрэбным аднавіць узоры моўнай дзейнасці 20-х гадоў XX ст. як у галіне правапісу, арфаэпіі, граматыкі, так і ў сферы словаўтварэння і словаўжывання. „Традыцыяналісты" выступаюць за захаванне (з некаторымі ўдакладненнямі) нормаў, што склаліся ў моўнай практыцы ў савецкі час. Пры гэтым адзначаецца, што „ў сацыяльных абставінах, калі літаратурная мова губляе

[1] *Biełaruskaja mowa: Najnowsze dzieje języków słowiańskich*, red. A. Lukašanec, M. Prigodzič, L. Sjameška, Opole 1998, s. 52–53. Hl. taksama: S. Zaprudski, *Staulennie da niekatorych inawacyj biełaruskaj mowy* (*pawodle dadzienych sacyjalinhwistycznaha apytannia*), „Studia Białorutenistyczne" 2008, 2, s. 303–327, [w:] http://www.bsu.by/Cache/pdf/213073.pdf.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 02/11/2026 15:06:37

свае пазіцыі ў грамадстве, лексічны разнабой наносіць ёй непапраўную шкоду”[2]. Функцыянаванне мовы ў такіх умовах не магло не паўплываць і на яе лексічную сістэму.

Характэрным для сучаснай беларускай мовы з’яўляецца тое, што ў ёй адбываецца „перагляд арыенціраў у моўным развіцці”[3], які закранае і працэсы запазычвання. Калі раней іншамоўная лексіка папаўнялася ў асноўным праз пасрэдніцтва рускай мовы і непасрэдна русізмамі, то пачынаючы з 90-х гадоў XX ст. праяўляецца тэндэнцыя пазбаўлення ад русізмаў, „робіцца прыкметны крэн у бок «заходніх» крыніц папаўнення лексічных сродкаў”[4], актывізуецца працэс запазычвання лексікі з польскай мовы і праз яе пасрэдніцтва. „Спецыфіка гэтага перыяду заключаецца ў тым, што, па-першае, пры захаванні тэндэнцыі на збліжэнне з рускай мовай (інтэрнацыяналізацыя) паралельна актуалізуецца тэндэнцыя на адштурхоўванне ад яе (нацыяналізацыя). Па-другое, адштурхоўванне ад рускай мовы ажыўляе тэндэнцыю на збліжэнне з польскай мовай (асабліва ў сферы лексікі)”[5]. Такім чынам, „у сучасных сацыялінгвістычных варунках гэта знаходзіць сваё адлюстраванне ў свядомым імкненні нацыянальна арыентаваных носьбітаў беларускай мовы абмежаваць, а часам проста ў некаторай ступені аслабіць відавочную блізкасць агульнага слоўнікавага фонду беларускай і рускай моў”[6]. Праўда, трэба заўважыць, што да русізмаў часта залічваюцца словы, па паходжанні агульныя для беларускай і рускай моў[7]. Пры гэтым лексічныя адзінкі, агульныя з рускай мовай, замяняюцца не толькі непасрэдна паланізмамі, але і наватворамі, запазычаннямі з украінскай мовы і словамі, вернутымі з пасіўнага запасу (словы, якія шырока выкарыстоўваліся ў 20-я гады XX ст., але з 30-х гадоў XX ст. знаходзіліся ў пасіўным запасе).

Характэрным у сувязі з вышэйсказаным з’яўляецца тое, што адны і тыя ж працэсы ў мове не толькі атрымліваюць палярныя ацэнкі, але і разглядаюцца неаднолькава: напрыклад, некаторыя лексемы рознымі даследчыкамі кваліфікуюцца або як запазычанні з польскай мовы, або як наватворы, або як словы, вернутыя

---

[2] A. I. Padłużny, *Nienarmatyunaja leksika u terminałohii i pieryjadycznym druku,* [u:] *Pierspiektywy razwiccia i funkcyjawannia narmatyunaj leksiki*: Art. i materyjały miżnar. nawuk.-mietad. kanf., 22–23 maja 1998 g., Homel: Homiel. dziarż. un-t imia F. Skoryny, 1998, s. 5.

[3] L. M. Szakun, *„Uschodnija” i „zachodnija” krynicy papauniennia leksicznych srodkau biełaruskaj mowy*, „Wiesnik Bieł. dziarż. un-ta. Sier. 4, Fiłałohija. Żurnalistyka. Piedahohika. Psichałohija” 1995, 2, s. 26.

[4] *Ibidem.*

[5] A. A. Łukaszaniec, *Miżsławianskaje mounaje uzajemadziejannie i dynamika litaraturnaj normy* (*biełaruskaja mowa pamiż ruskaj i polskaj*)*,* [u:] *Idem*, *Biełaruskaja mowa u XXI stahoddzi: razwiccio sistemy i prablemy funkcyjanawannia,* Minsk: Biełaruskaja nawuka, 2014, s. 48.

[6] I. R. Szkraba, *Waryjantnaść u sfiery inawacyj*, [u:] *Jazyk i socyum*: Matieriały IV Miežđunar. naucz. konf, 1–2 diek. 2000 g, w 2 cz., cz. 2, Minsk: Biełorusskij gosudarstwiennyj uniwiersitiet, 2001, s. 103.

[7] A. I. Żurauski, *Prablemy norm biełaruskaj litaraturnaj mowy*, AN Biełarusi. Bieł. kam. sławistau, Minsk 1993, s. 27.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 02/11/2026 15:06:37

з пасіўнага запасу[8]. Адпаведна, і ацэнку гэтыя працэсы атрымліваюць супрацьлеглую, ад вострa негатыўнай да адабральнай[9]. Прывядзём у гэтай сувязі словы А. І. Падлужнага: „За гістарычна кароткі перыяд ужо не пачуеш, што хто-небудзь нешта расказвае або гаворыць, трэба толькі *распавёў*, *мовіў*. Замена спрадвечна беларускіх слоў набыла характар стыхійнага няшчасця. Амаль цалкам выгнана слова *рысунак*, бо пішуць і гавораць толькі *малюнак*, хоць у беларускай мове дзесяткі слоў з коранем *-рыс-*; ужо няма *паражэнняў*, а ёсць *паразы*; няма *вечарынак*, затое ёсць *вечарыны* і *імпрэзы*; звычайным стала *напрыканцы*, а *ў канцы* ўжо знікла цалкам; няма *паслоў* ёсць толькі *амбасадары*; зніклі *выстаўкі*, бо з'явіліся *выставы*; замест *напіткаў* з'явіліся *напоі*, замест *выступленняў – выступы* і да т. п."[10]. Цікава, што апошнім часам быў знойдзены своеасаблівы кампраміс. Так, на думку А. А. Лукашанца, асобныя запазычанні з блізкароднасных моў з пазіцый сінхроннага словаўтварэння цалкам адпавядаюць усім прыкметам матываванага слова (маюць адпаведную словаўтваральную базу і вядомы словаўтваральнай сістэме беларускай мовы словаўтваральны фармант). Таму іх „запазычанасць" у пэўным сэнсе адступае на другі план і яны маюць усе падставы разглядацца як уласныя ўтварэнні[11]. І такі пункт погляду мае месца, паколькі запазычванне ўяўляе сабой працяглы працэс ператварэння іншамоўных лексічных сродкаў у словы, падобныя спрадвечным. Гэты працэс прадугледжвае фанетыка-графічнае, граматычнае, словаўтваральнае і, галоўнае, семантычнае засваенне іншамоўных лексем. У выніку запазычанні ўваходзяць у слоўнікавы склад прымаючай мовы і выразна адрозніваюцца ад адпаведных лексем мовы-крыніцы.

---

[8] A. J. Bachańkou, H. F. Wiesztart, A. M. Pryszczepczyk, *Ci hłyboka dumau recenzient?*, „Połymia" 1987, 12, s. 209–211; I. Burłyka, M. Daniłowicz, N. Pamiećka, P. Sciacko, *Ci niama u artykule Pauła Szuby biełarusafobstwa?*, „Rodnaje słowa" 1997, 12, s. 91–102; I. U. Kandracienia, *Nulsufiksalnyja nazouniki wa uschodniesławianskich i polskaj mowach*, [u:] *Biełaruskaja i ruskaja mowa u Biełarusi: Prablemy funkcyjanawannia i uzajemadziejannia*. Tez. dakł. nawuk. kanf., pryswiecz. 20-hoddziu addz. biełsrus.-rus. moun. suwiaziej (siektara ruskaj mowy), NAN Biełarusi, In-t mowaznaustwa, red. A. A. Łukaszaniec, Minsk 1997, s. 35–36; *Eadem*, *Nulawaja sufiksacyja u sistemie suczasnaha biełaruskaha słowautwarennia*, [u:] *Biełaruskajaя mowa u druhoj pałowie XX stahoddzia*: Materyjały Miżnar. nawuk. kanf., Minsk 1998, s. 113–115; A. A. Kaurus, *Da swajho słowa*, „Połymia" 1995, 5, s. 270–281; L. Kacapau, *Wystauka – słowa na cwiordym hruncie*, „Nastaunickaja hazieta" 2002, 5 studz.; I. J. Lepieszau, *Nowyja słowy aposznich hadou*, „Rodnaje słowa" 1999, 2, s. 77–85; P. Sadouski, *Czas odumu. Da wychadu 5-tomnaha Tłumaczalnaha słounika biełaruskaj mowy*, „Połymia" 1986, 5, s. 168–180; P. U. Sciacko, *Wystawa… Naturalnaje u biełaruskaj mowie słowa*, „Rodnaje słowa" 1994, 1, s. 31–33; *Idem*, *Prablemy leksicznaha narmawannia biełaruskaj mowy:* nawucz. dapam., Hrodna 1999; *Idem*, *Prablemy normy, kultury mowy:* nawucz. dapam., Hrodna 1998; *Idem*, *Pra wystawu i smietankowaje masła*, „Rodnaje słowa" 1992, 6, s. 40, 56; P. P. Szuba, *Polski upływ na mowu biełaruskich srodkau masawaj infarmacyi*, „Rodnaje słowa" 1997, 10, s. 65–82 i insz.

[9] Hl.: S. Zaprudski, *op. cit.*

[10] A. I. Padłużny, *Mowa: suczasnaść i buduczynia*, „Biełaruskaja dumka" 2006, 10, s. 163.

[11] A. A. Łukaszaniec, *Prablemy suczasnaha biełaruskaha słowautwarennia*, Minsk: Biełaruskaja nawuka, 2013, s. 33.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 02/11/2026 15:06:37

Да таго ж, на наш погляд, ацэначны падыход у лінгвістыцы не заўсёды прымальны, бо ён не дазваляе вызначыць унутраны стан мовы і тэндэнцыі яе развіцця. Асабліва гэта датычыць сінхроннага этапу, на якім прагназаванне развіцця лексічнай сістэмы беларускай мовы можа насіць толькі ўмоўны характар. Звычайна толькі моўная практыка здольна паказаць, якія з новых лексем замацуюцца ў яе слоўнікавым складзе.

У любым выпадку запазычанні адыгрываюць вялікую ролю ў працэсе ўзаемадзеяння блізкіх моў. Непасрэднае ўспрыманне, уключэнне ў слоўнікавы склад беларускай мовы слоў з блізкароднасных моў адбываецца з надзвычайнай лёгкасцю, таму што граматычны лад, слоўнікавы склад і тыпы словаўтварэння такіх моў даволі блізкія. Аднак, калі роднасць моў і спрыяе запазычванню слоў, яна ж і ўскладняе справу вызначэння такіх слоў у асяроддзі слоўнікавага складу беларускай мовы[12]. Не ўсе запазычанні могуць быць выяўлены, бо пры іх вызначэнні нельга кіравацца толькі супадзеннем каранёў[13]. З прычыны ўсё той жа „генетычнай і структурнай блізкасці моў”[14] могуць быць запазычаны і такія словы, якія па сваёй марфалагічнай форме не супярэчаць адпаведным заканамернасцям беларускай мовы. У выніку можа атрымацца, што марфалагічная і фанетычная форма і значэнне пэўнага слова адпавядаюць заканамернасцям беларускай мовы, і яно на гэтай падставе лічыцца спрадвечнабеларускім словам, а ў сапраўднасці можа аказацца запазычаннем[15], ці наадварот.

Найбольш цеснымі і глыбокімі па сваіх выніках на працягу ўсёй гісторыі былі папераменна кантакты беларускай мовы то з польскай, то з рускай мовамі, а ў асобныя перыяды – адначасова і з той і з другой[16]. Беларуска-польскія моўныя кантакты маюць даўнюю гісторыю. На розных этапах свайго развіцця беларуская мова з большай ці меншай інтэнсіўнасцю запазычвала словы з польскай мовы і праз яе пасрэдніцтва. У XIX – пач. XX стст., калі працякаў інтэнсіўны працэс фарміравання агульнанацыянальнай мовы беларускага народа, польскі ўплыў заставаўся магутным фактарам развіцця і папаўнення беларускай лексікі. Актыўна запазычвалася польская лексіка і ў 20-я гады XX ст. Але пачынаючы з 30-х гадоў уваходжанне паланізмаў у беларускую лексіку амаль што не адбывалася па ідэалагічных прычынах і з-за паслаблення беларуска-польскіх кантактаў. З 90-х гадоў XX ст. роля польскай мовы як крыніцы запазычвання новых слоў зноў узмацнілася. Запазычваюцца не толькі ўласна паланізмы, але і словы, што раней былі запазычаны польскай мовай з іншых моў. Такім чынам польская мова

[12] M. I. Krukouski, *Ruski leksiczny upływu na suczasnuju biełaruskuju litaraturnuju mowu*, Minsk 1958, s. 12.

[13] L. Ramaniuk, *Da historyi polska-biełaruskich leksicznych uzajemasuwiaziej*, [u:] *Nawukowy zbornik*, Biełastok 1964, s. 264.

[14] A. J. Bachańkou, *Razwiccio leksiki biełaruskaj litaraturnaj mowy u sawiecki pieryjad. Sacyjalinhwistyczny narys*, Minsk 1982, s. 135.

[15] M. I. Krukouski, *op. cit.,* s. 94.

[16] A. J. Bachańkou, *op. cit.,* s. 134.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 02/11/2026 15:06:37

выступае як пасрэдніца ў перадачы слоў, што раней былі запазычаны ёю з заходнееўрапейскіх моў. Акрамя таго, актывізаваўся працэс ажыўлення ўстарэлых слоў. Выходзяць з пасіўнага запасу словы, якія былі запазычаны беларускай мовай з польскай раней, выкарыстоўваліся ў мове ў пачатку XX ст. (да 30-х гадоў) і былі зафіксаваны слоўнікамі таго часу.

І новыя, і актуалізаваныя паланізмы звычайна не абазначаюць новыя паняцці, а з'яўляюцца дублетамі нарматыўных лексем. Яны „выступаюць своеасаблівымі «канкурэнтамі» агульных з рускай мовай лексем, імкнучыся выцесніць іх на перыферыю моўнай камунікацыі"[17].

Паланізмы адносяцца да агульнаўжывальнай лексікі. У адрозненне ад запазычанняў з заходнееўрапейскіх моў, са славянскіх моў (у тым ліку з польскай) запазычваюцца не толькі назоўнікі, але і словы іншых часцін мовы (прычым многія лексемы з'яўляюцца аднакаранёвымі), што тлумачыцца фанетычнай, марфалагічнай і лексічнай блізкасцю гэтых моў. Яны адносяцца да розных лексіка-семантычных груп, сярод якіх, тым не менш, цяжка вызначыць пэўныя пераважаючыя (у параўнанні з лексікай, запазычанай з заходнееўрапейскіх моў, у большасці з англійскай і яе амерыканскага варыянта, дзе выразна выдзяляюцца пэўныя групы лексікі: эканамічная, грамадска-палітычная, сферы інфармацыйных тэхналогій і г.д.).

Нягледзячы на адмоўнае стаўленне да такіх інавацый з боку акадэмічнага мовазнаўства (гл. вышэй), многія з паланізмаў настолькі шырока ўжываюцца ў розных тэкстах сучаснай беларускай мовы, што яны пачалі фіксавацца ў разнастайных лексікаграфічных выданнях, у тым ліку ў нарматыўных.

Неабходнасць апісання новай лексікі беларускай мовы заўсёды ўсведамлялася беларускімі лексікографамі, і неалагізмы ўключаліся ў тлумачальныя і перакладныя слоўнікі. Так, у прадмове да *Тлумачальнага слоўніка беларускай мовы* сказана, што „ў *Слоўнік* уключаны […] новыя словы, утвораныя з беларускіх словаўтваральных элементаў або запазычаныя з іншых моў і засвоеныя шырокімі коламі грамадскасці (акселерацыя, дызайнер, касмабачанне, ленініяна, праграміст)"[18]. Падобную заўвагу знаходзім і ў прадмове да *Тлумачальнага слоўніка беларускай літаратурнай мовы* (далей – ТСБЛМ): „у слоўнік уключана шмат новых слоў, якія пачалі актыўна ўжывацца ў апошнія гады […]. Сярод такой лексікі – словы з іншамоўнай асновай, словы, утвораныя ад іншамоўнай асновы пры дапамозе беларускіх марфалагічных сродкаў, і ўласна беларускія словы"[19].

---

[17] H. Arciamionak, *Biełaruska-polskaje leksicznaje uzajemadziejannie na suczasnym etapie*, [u:] *Biełaruskaja mowa: szlachi razwiccia, kantakty, pierspiektywy*: Materyjały III Miżnar. kanhresa biełarusistau, red. H. Cychun i insz., Minsk 2001 (Biełarusika = Albaruthenica, kn. 19), „Biełaruski knihazbor", s. 147.

[18] *Tłumaczalny słounik biełaruskaj mowy*, red. K. K. Atrachowicz (K. Krapiwa), [u 5 t.], t. 1, Minsk 1977, Biełaruskaja sawieckaja encykłapiedyja, Minsk 1977, s. 7.

[19] *Tłumaczalny słounik biełaruskaj litaraturnaj mowy*, red. M. R. Sudnik, M. N. Kryuko, 2 wyd., Biełaruskaja encykłapiedyja im. Pietrusia Brouki, Minsk 1999, s. 3.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 02/11/2026 15:06:37

Аднак у нарматыўныя слоўнікі звычайна ўключаюцца словы, „засвоеныя шырокімі коламі грамадства". Так, у прадмове да ТСБЛМ адзначана: „У апошнія гады ў сродках масавай інфармацыі, у публіцыстычных і інш. выданнях пачала ўжывацца вялікая колькасць слоў, сярод якіх ёсць яўныя словы-аднадзёнкі, калькі, што маюць раўназначныя беларускія эквіваленты, а таксама шматлікія іншамоўныя словы, якія пранікаюць у беларускую мову ў іх непасрэдным гучанні. Аўтарамі і рэдактарамі такія словы ў *Слоўнік* уключаліся з вялікай доляй асцярожнасці. Яны, думаецца, павінны прайсці яшчэ праверку часам"[20].

Сапраўды, толькі моўная практыка здольна паказаць, якія з наватвораў замацуюцца ў слоўнікавым складзе. Аднак у такім выпадку па-за слоўнікавай фіксацыяй застаецца вельмі багаты матэрыял, які адлюстроўвае найбольш рухомую частку слоўнікавага складу на ўзроўні кароткага часавага адрэзка, дэманструе моўную дынаміку, складаныя працэсы развіцця і фарміравання лексічнага складу пэўнай мовы ў канкрэтны перыяд часу. Такую задачу закліканы выконваць неаграфічныя выданні. У беларускім мовазнаўстве першым прыкладам неаграфічнага даследавання стаў *Слоўнік новых слоў беларускай мовы* В. І. Уласевіч і Н. М. Даўгулевіч (2009; далей – СНС)[21]. У *Слоўніку* прадстаўлена лексіка аднаго са складаных і супярэчлівых момантаў гісторыі беларускай мовы: канец XX – пачатак XXI стст., у тым ліку ў ім зафіксаваны запазычанні з польскай мовы і актуалізаваная лексіка польскага паходжання.

Галоўнай праблемай пры стварэнні слоўнікаў новых слоў у беларускай мове з'яўляецца тое, што тут заўсёды прысутнічае пэўная ступень суб'ектыўнасці яго стваральнікаў. Гэтая праблема ўзмацняецца тым, што Нацыянальны корпус беларускай мовы знаходзіцца толькі на стадыі стварэння. Таму ў неалагічных слоўніках у большасці выпадкаў не можа быць пададзены канкрэтны час першай фіксацыі слова ў мове, ступень распаўсюджанасці і асаблівасці выкарыстання ў тэкстах розных функцыянальных стыляў і пад. Безумоўна, „кожны асобны даследчык або ўкладальнік не ў стане ахапіць і прааналізаваць вялікія аб'ёмы інфармацыі без выкарыстання сучасных камп'ютарных тэхналогій. У такой сітуацыі адзіна магчымым выйсцем з'яўляецца стварэнне Нацыянальнага корпуса беларускай мовы, які ўключаў бы ў сябе тэксты рознай стылёвай і жанравай прыналежнасці і ахоплівaў бы ўсе перыяды новай беларускай літаратурнай мовы"[22].

[20] *Tłumaczalny słounik biełaruskaj litaraturnaj mowy*, s. 4.

[21] W. I. Ułasiewicz, N. M. Dauhulewicz, *Słounik nowych słou biełaruskaj mowy*, Instytut mowy i litaratury imia Jakuba Kołasa i Janki Kupały NAN Biełarusi, Minsk: Wydawiectwa „TetraSistems", 2009.

[22] I. L. Kapyłou, U. A. Koszczanka, *Korpus tekstau jak asnowa aptymizacyi padrychtouki fundamientalnaha „Tłumaczalnaha słounika biełaruskaj mowy"*, [u:] *Kompjutiernaja lingwistika: nauczznoje naprawlenije i uczebnaja discyplina*: sb. naucz. statiej, wyp. 1, ried. W. I. Kowal, Gomiel: Gomielskij gosudarstwiennyj uniwiersitiet, im. F. Skoriny, 2010, s. 13.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 02/11/2026 15:06:37

Уключэнне паланізмаў у нарматыўныя арфаграфічныя і перакладныя слоўнікі таксама адбываецца ў сітуацыі, калі Нацыянальны корпус беларускай мовы ў поўным аб'ёме яшчэ адсутнічае. Таму і тут можна гаварыць пра пэўную суб'ектыўнасць лексікографаў. Тым не менш, новыя паланізмы пачынаюць фіксавацца нарматыўнымі слоўнікамі. Параўнаем, наколькі лексемы, зафіксаваныя ў СНС, прадстаўлены ў акадэмічных слоўніках, выдадзеных на працягу апошніх гадоў[23].

АВАНГАРДО́ВЫ, *прым.* (польск. awangardowy). Які мае адносіны да авангардызму; авангардны, авангардысцкі. *Браў удзел у шэрагу выстаў* ***авангардовага*** *накірунку.* – ЛіМ 1998, № 18, с. 3. *А тыя, каму не хапіла месца ў першых элітэкіпажах* ***авангардовых*** *„літшатлаў", не спяшаюцца засмучацца.* – ЛіМ 1996, № 1, с. 4. Лексема фіксуецца толькі СНС.

АМБАСА́ДА, -ы, *ж.* (польск. ambasada, ад фр. ambassade; англ. embassy). Пасольства. *Дарэчы,* ***амбасада*** *Ізраіля на Беларусі зрабіла добрай традыцыяй папаўненне фондаў бібліятэк яўрэйскай літаратурай.* – ЛіМ 1997, № 38, с. 2. *Саветнік па культуры* ***амбасады*** *Францыі ў Беларусі Сільвія Лемасон перадала ў падарунак кнігі аб Шагале.* – „Звязда" 2002, 9 ліпеня. Лексема **амбасада** зафіксавана ў *Слоўніку беларускай мовы*[24] (далей – СБМ)*, Беларуска-рускім слоўніку*[25] (далей – БРС)*, Руска-беларускім слоўніку*[26] (далей – РБС)*, Граматычным слоўніку назоўніка*[27] (далей – ГСН). Пры гэтым у РБС гэты варыянт падаецца другім пасля лексемы **пасольства:** *посольство – пасольства, амбасада*.

АМБАСА́ДАР і АМБАСАДО́Р, -а, *м.* (польск. ambasador, ад фр. ambassadeur; англ. ambassador). Пасол. *На вернісажы* ***амбасадар*** *Францыі ў Беларусі спадар Жаліф гаварыў, што Марк Шагал… належыць усяму чалавецтву.* – ЛіМ 1997, № 24, с. 2. *У не так вялікім Боне, пакуль яшчэ сталіцы аб'яднанай Германіі, ёсць* ***амбасадар*** *Беларусі*. – ЛіМ 1996, № 25. с. 15. *Ладзім цяпер адносіны з Бермудскім трохвугольнікам. Зацвердзілі тэкст дагавора, персону* ***амбасадора***. – ЛіМ 1998, № 8, с. 16. Лексема **амбасадар** зафіксавана СБМ, БРС, РБС і ГСН. У РБС падаецца пасля лексемы **пасол**: *посол – пасол, амбасадар.* Варыянт **амбасадор** слоўнікамі не фіксуецца.

---

[23] Паколькі разгледзець усе паланізмы, зафіксаваныя ў СНС, у адным артыкуле не ўяўляецца магчымым, прывядзём толькі найбольш характэрныя прыклады.

[24] *Słounik biełaruskaj mowy*, red. A. A. Łukaszaniec, W. P. Rusak, NAN Biełarusi, In-t mowy i lit. imia Jakuba Kołasa i Janki Kupały, Minsk 2012.

[25] *Biełaruska-ruski słounik*, u 3 t. (Bolsz za 110.000 słou), red. A. A. Łukaszaniec; NAN Biełarusi, In-t mowy i litaratury imia Jakuba Kołasa i Janki Kupały, 4 wyd., pieraprac. i dap., Minsk 2012.

[26] *Russko-biełorusskij słowar' / Ruska-biełaruski słounik*, 3 t., red. A. A. Łukaszaniec, NAN Biełarusi, In-t jazyka i litieratury im. Jakuba Kołasa i Janki Kupały, izd. 10, pierierab. i dop., Minsk 2012.

[27] *Hramatyczny słounik nazounika*, red. W. P. Rusak, NAN Biełarusi, Centr dasled. biełarus. kultury, mowy i lit., „In-t mowy i lit. imia J. Kołasa i J. Kupały", 2 wyd., daprac., Minsk 2013. Ibidem.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 02/11/2026 15:06:37

АДСО́ТАК, -тка, *м.* (польск. odsetek, укр. відсоток). Працэнт. *Дзевяноста восем* ***адсоткаў*** *сённяшняга Саюза пісьменнікаў займаюць тую ж самую пазіцыю, як „Тутэйшыя" дзесяць гадоў таму.* – ЛіМ 1998, № 17, с. 7. *Віно цябе супакоіла на тры* ***адсоткі****, астатнія дзевяноста сем – ты сам сябе вылечыў.* – „Маладосць" 1998, № 5, с. 146. Адны даследчыкі разглядаюць бел. *адсотак* як запазычанне з украінскай мовы[28], другія – як запазычанне з польскай мовы[29]. Лексема выкарыстоўвалася ў беларускай мове ў 20-я гады XX ст., упершыню зафіксавана ў 1-м выпуску *Беларускай навуковай тэрміналогіі*[30] (далей – БНТ-1)*: процент – адсотак, процант*. Фіксуецца *Беларуска-расейскім слоўнікам* і *Расейска-беларускім слоўнікам* М. Байкова і С. Некрашэвіча[31] (далей – БРС–26 і РБС–28). Лексема **адсотак** прадстаўлена ў СБМ, БРС, РБС, але адсутнічае ў ГСН. У РБС: *процент – працэнт, адсотак.*

АНГЕ́ЛЬСКІ, *прым.* (польск. angelski). Англійскі. *Здзіўляе ўзровень валодання ўдзельнікамі семінара* ***ангельскай*** *мовай.* – ЛіМ 1998, № 3, с. 15. *Беларускі тэкст суправаджаўся* ***ангельскім*** *перакладам…* – ЛіМ 1998, № 29, с. 6. Лексема *ангельскі* зафіксавана ў БРС–26, РБС–28 і ў слоўніку Станкевіча[32] (далей – Стан-92). У БРС: *ангельскі* – уст., разг. *аглицкий*. У СБМ і РБС лексема не прадстаўлена.

ВЫБІ́ТНЫ, *прым.* (польск. wybitny). Выдатны, выключны, незвычайны. *Радасным смехам адорвае мяне Мудроў са сваім Іванам Бяньковым – можа, самым* ***выбітным*** *персанажам у сучаснай беларускай прозе.* – ЛіМ 1996, № 22, с. 6. *Работа нямецкіх лялечнікаў пакінула глыбокае ўражанне найвышэйшай прафесійнасцю… – ад выканання лялек да* ***выбітнай*** *тэхнікі лялькаваджэння.* – ЛіМ 1996, № 48, с. 11. Фіксуецца СБМ, адсутнічае ў БРС, РБС. Прыслоўе **выбітна** (польск. wybitnie – выключна, выдатна, незвычайна) фіксуецца толькі СБМ; назоўнік **выбітнасць** (польск. wybitność – незвычайнасць, выключнасць) прадстаўлены ў СБМ і ГСН.

ВЫ́КШТАЛЦІЦЬ, *зак.* (польск. wykształcić). Адукаваць, выхаваць, сфарміраваць, развіць. *Тэлефільм „Пастка для зубра" і рэжысёр В. Шавялевіч* ***выкшталцілі*** *для купалаўцаў выбітнага Ягайлу.* – ЛіМ 1998, № 4, с. 10. Дзеяслоў **выкшталціць**, як і прыметнік **выкшталцоны** (польск. wykształcony), фіксуецца толькі СНС.

[28] M. H. Bułachau, *Razwiccio biełaruskaj litaraturnaj mowy u XIX–XX stst. wa uzajemaadnosinach z inszymi sławianskimi mowami*, Minsk 1958, s. 43.

[29] *Leksikałohija suczasnaj biełaruskaj litaraturnaj mowy*, red. A. J. Bachańkou, Minsk 1994, s. 176.

[30] *Biełaruskaja nawukowaja terminolohija,* wyp. 1. *Elementarnaja matematyka*, Miensk 1922.

[31] M. Bajkou, Ś. Niekraszewicz, *Biełaruska-rasijski słounik*, *Dziarżaunaje wydawiectwa Biełarusi*, Miensk 1926; Ś. Niekraszewicz, M. Bajkou, *Rasijska-biełaruski słounik*, Minsk 1928.

[32] J. Stankiewicz, *Biełaruska-rasijski (Wialikalitouska-rasijski) słounik* / *Byelorussian-Russian* (*Greatlitvan-Russian*) Dictionary, New York: Published by: Lew Sapieha Greatlitvan (Byelorussian) Foundation, 1992.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 02/11/2026 15:06:37

ВЫСТА́ВА, -ы, *ж.* (польск. wystawa; укр. вистава). Выстаўка. *Напачатку мая ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь пачала сваю экспазіцыйную працу адна асаблівая* ***выстава****.* – ЛіМ 1996, № 22, с. 15. *Наведвальнікаў большасці рынкаў і гандлёвых* ***выстаў*** *сталіцы і некаторых буйных гарадоў краіны 31 ліпеня чакала расчараванне – пустыя гандлёвыя рады ці нязгода прадпрымальнікаў рэалізоўваць тавары.* – „Звязда" 2002, 2 жніўня. А. А. Лукашанец адзначае, што „запазычаны з польскай мовы назоўнік **выстава**… сімвалізуе ажыўленне непрадуктыўнага словаўтваральнага тыпу „аснова дзеяслова + нулявы суфікс + нехарактэрная змена націску"[33]. П. У. Сцяцко, наадварот, даказвае, што „ў беларускай мове якраз зусім натуральныя суадносіны ўтваральных і вытворных словаў гэтай мадэлі"[34]. Лексема фіксуецца СБМ, ГСН і РБС, але адсутнічае ў БРС. У РБС: *выставка – выстаўка, выстава;* але: *выставка-продажа – выстаўка-продаж.* У СНС, СБМ і ГСН зафіксаваны лексемы **выстава-кірмаш, выстава-конкурс, выстава-продаж** і **выстава-прэзентацыя**, якія не фіксуюцца перакладнымі слоўнікамі. Пры гэтым цікава, што ў СБМ і ГСН прадстаўлена толькі лексема **выстаўка-продаж** і няма лексем **выстаўка-кірмаш, выстаўка-конкурс** і **выстаўка-прэзентацыя**.

ГЖЭ́ЧНЫ, *прым.* (польск. grzeczny). Ветлівы, выхаваны, далікатны, пачцівы. *Ці ёй ужо абыякавае ягонае пачуццё, пачуццё вясковага юнака, які добра вучыцца і, як усе лічаць,* ***гжэчны****?* – „Полымя" 1996, № 4, с. 92. *Ды гэтым разам гэты* ***гжэчны*** *масквіч абурыў мяне безадказнасцю.* – ЛіМ 1998, № 39, с. 10. Прыметнік **гжэчны**, як і назоўнік **гжэчнасць** (польск. grzeczność), фіксуецца толькі СНС.

ЗАДЗІНО́ЧАННЕ, -я, *н.* (польск. zjednoczenie). Аб'яднанне. *У нашай сітуацыі* ***задзіночанне*** *патрэбнае для ратавання ад смерці ягоных супольнікаў.* – „Маладосць" 1998, № 7, с. 234. *Сярод маладзёжных арганізацый сёння вылучаецца студыя „Ліцвіны" – дзеішча творчага калектыву, у які ўваходзяць і былыя сябры літаратурна-мастацкай суполкі* ***Задзіночання*** *беларускіх студэнтаў.* – ЛіМ 1998. № 2, с. 10. Зафіксаваны Стан-92. Фіксуецца СБМ і РБС (*объединение – аб'яднанне,* [товарищество, организация – еще] *задзіночанне, згуртаванне*); адсутнічае ў ГСН і БРС.

ІМПРЭ́ЗА, -ы, *ж.* (польск. impreza). Мерапрыемства. *У Наваполацку адбылася* ***імпрэза****, прысвечаная 3-годдзю Таварыства вольных літаратараў.* – ЛіМ 1996, № 24, с. 6. *Адчуваю толькі, як і ў ранейшых палітычных* ***імпрэзах****, пэўную накіраванасць.* –„Полымя" 1997, № 12, с. 96. Лексема фіксуецца СБМ і ГСН, але адсутнічае ў РБС. У БРС: *імпрэза – импреза* (відавочна, што гэта памылка, бо ў слоўніках рускай мовы лексема **импреза** адсутнічае).

[33] A. A. Łukaszaniec, *Aktyunyja pracesy u suczasnym biełaruskim słowautwarenni*, [u:] *Biełaruskaja mowa u druhoj pałowie XX stahoddzia:* Materyjały Miżnar. nawuk. kanf., Biełaruski dziarżauny uniwiersitet, Minsk 1998, s. 25.

[34] P. U. Sciacko, *Wystawa… Naturalnaje u biełaruskaj mowie słowa*, s. 32.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 02/11/2026 15:06:37

ІНСТЫТУ́ЦЫЯ, -і, *ж.* (польск. instytucja). Установа, арганізацыя. *Значыць, трансфармацыя свядомасці грамадства мажлівая… у выпадку пашанотнага стаўлення да беларускай культуры, гісторыі і мовы ў дзяржаўных афіцыйных* ***інстытуцыях***. –ЛіМ 1998, № 20, с. 5. *Я, здаецца, перамацаў усе магчымыя дзяржаўныя, грамадскія, палітычныя і сацыяльныя* ***інстытуцыі***. – ЛіМ 1998, № 17, с. 5. Лексема зафіксавана ў РБС–28. Фіксуецца СБМ і ГСН, але адсутнічае ў БРС і РБС.

КАЛЯЖА́НКА і КАЛЕЖА́НКА, -і, *ж.* (польск. koleżanka). Дзяўчына або жанчына, якая вучыцца, працуе з кім-небудзь; калега, таварыш па працы. *Пётр Еўдакімавіч… не мог не паважаць сваю* ***каляжанку***. – „Полымя" 1998, № 6, с. 57. *У паштальёнаў Алены Ульчык і Аксаны Баравік адукацыя незакончаная (пакуль) вышэйшая, у іх* ***каляжанак*** *– сярэдняя.* – „Звязда" 2005, 17 снежня. *Калі на сцэну выйшла наша* ***калежанка****, журналістка з Літвы, зала ўстала.* – ЛіМ 1997, № 9, с. 10. ***Калежанка*** *мая… не магла даўмецца: скуль у людзях такая настальгія па мінулым.* – ЛіМ 1998, № 22, с. 10. Варыянт **калежанка** зафіксаваны ў *Слоўніку беларускіх гаворак паўночна-заходняй Беларусі і яе пагранічча*[35]*;* **каляжанка** (і **куляжанка**) – у *Слоўніку гаворак цэнтральных раёнаў Беларусі*[36]. Варыянт **каляжанка** фіксуецца СБМ і ГСН, але адсутнічае ў БРС і РБС. Варыянт **калежанка** ў нарматыўных слоўніках не зафіксаваны. Узнікненне варыянтаў звязана з праблемай адлюстравання ці неадлюстравання якання ў словах іншамоўнага паходжання.

КАМЕНТА́Р, -у, *м.* (польск. komentarz; укр. коментар). Каментарый. *Укладанне, рэдагаванне і* ***каментар*** *зборніка – Сяргея Панізніка.* – ЛіМ 1996, № 40, с. 13. *Наша задача – давесці іх да гледача, звёўшы на нішто свой* ***каментар***. – ЛіМ 1996, № 35, с. 11. Фіксуецца толькі СНС.

КІРО́ЎЦА, -ы, *м.* (польск. kierowca). Вадзіцель, шафёр. ***Кіроўца*** *53-га тралейбуса абвяшчае прыпынкі па-беларуску.* – ЛіМ 1998, № 33, с. 5. *Як паведамілі БелаПАН у аддзеле ўнутраных спраў на транспарце УУС Брэсцкага аблвыканкама,* ***кіроўца*** *выехаў на чыгуначныя пуці пры працуючай светлавой і гукавой сігналізацыі.* – „Народная воля" 2004, 1 чэрвеня. Фіксуецца СБМ і ГСН, але адсутнічае ў БРС і РБС.

КУЛЬТУРО́ВЫ, *прым.* (польск. kulturowy). Культурны. *Згадваю ўсё чыста спантанна. І вяду гаворку пра* ***культуровыя*** *абшары.* – ЛіМ 1998, № 6, с. 14. Фіксуецца толькі СНС.

КШТА́ЛЦІЦЬ, *незак.* (польск. kształcić). Развіваць, вучыць. *Прафесія аператара… вымагае ад носьбіта-творцы* ***кшталціць*** *сябе.* – ЛіМ 1997, № 10, с. 11. Фіксуецца толькі СНС (як і дзеяслоў **кшталцiцца** [польск. kształcić się]).

[35] *Słounik biełaruskich haworak paunoczna-zachodniaj Biełarusi i jaje pahraniczcza*, t. 2, red. J. F. Mackiewicz, Minsk: Nawuka i technika, 1980, s. 372.

[36] *Słounik haworak centralnych rajonau Biełarusi,* [u 2 t.], t. 1, red. J. S. Miacielskaja, Minsk: Uniwiersiteckaje, 1990 s. 179.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 02/11/2026 15:06:37

МА́ПА, -ы, *ж.* (польск. mapa). Геаграфічная карта. *Парыжэлая…, старая* ***мапа*** *Гродзенскай губерні таксама ўтрымлівае ў гэтым месцы шуканую назву…* – „Полымя" 1997, № 12, с. 175. *І калі зірнуць на палітычную* ***мапу****, то сёння рэгіянальная Еўропа прыкладна нагадвае Еўропу часоў Свяшчэннай Рымскай імперыі…* – „Маладосць" 1998, № 5, с. 197. Гэта слова было запазычана беларускай мовай праз польскую (польск. mapa 'геаграфічная карта', ад ням. Mappe; параўн.: англ. map) прыблізна ў другой палове ці нават у канцы XIX ст.[37], зафіксавана *Этымалагічным слоўнікам беларускай мовы*[38]. У 20-я гады XX ст. лексема **мапа** шырока выкарыстоўвалася і зафіксавана БРС-26 і РБС-28. Слова вядома некаторым беларускім гаворкам, яно зафіксавана *Слоўнікам гаворак цэнтральных раёнаў Беларусі*[39]*:* **мапа** – *карта*. У наш час слова **мапа** фіксуе *Слоўнік безэквівалентнай лексікі*[40]. Іншымі слоўнікамі лексема не фіксуецца.

НАКЛА́Д, -у, *м.* (польск. nakład). Тыраж. *Альбом выйшаў* ***накладам*** *у дзве тысячы асобнікаў.* – ЛіМ 1998, № 13, с. 3. *...Перад навагоднімі святамі быў аддрукаваны дадатковы* ***наклад*** *„Каралёў раёну", які можа быць выдатным падарункам для сяброў, якія за сталом любяць спяваць нашы застольныя песні.* – „Звязда" 2004, 9 студзеня. У БРС–26: ***наклад*** *– ижди́вение, сре́дства; нало́г*. Фіксуецца СБМ, ГСН, БРС і РБС (*тираж – тыраж, наклад*).

НАПО́Й, -ю, *м.* (польск. napój, укр. напій). Напітак, пітво. *За ўжыванне алкаголю на вытворчасці затрымана больш за 23 тысячы чалавек, за з'яўленне ў п'яным відзе ў грамадскіх месцах і распіццё спіртных* ***напояў*** *там, дзе гэта забаронена, – амаль 300 тысяч.* – ЛіМ 1998, № 32, с. 5. *Павялічылася вытворчасць мясных і раслінных кансерваў, безалкагольных* ***напояў****.* – „Звязда" 2002, 5 ліпеня. Лексема зафіксавана БРС–26 і РБС–28. Прадстаўлена ў *Руска-беларускім слоўніку* (1953)[41]. Фіксуецца СБМ, ГСН і РБС (*напиток – напітак, напой*), але адсутнічае ў БРС.

НАСТУ́ПСТВА, -а, *н.* (польск. następstwo). Вынік. *Памятаецца, адно з іх* [пытанняў] *тычылася праблем, звязаных з* ***наступствамі*** *чарнобыльскай катастрофы.* – „Маладосць" 1997, № 6, с. 194. *Дэкрэт Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 16 Аб упарадкаванні выкарыстання сродкаў, якія накіроўваюцца на ліквідацыю* ***наступстваў*** *катастрофы на Чарнобыльскай АЭС.* – „Звязда" 2002, 17 ліпеня. У БРС–26: *наступства – преемство, преемственность*. З падобнымі значэннямі фіксуецца ў Стан–92. Лексема не зафіксавана ў ТСБЛМ, але выка-

[37] I. K. Hiermanowicz, *Pałanizny u biełaruskaj litaraturnaj mowie 20 – pierszaj paławinie 30-ch hadou XX stahoddzia*, „Wiesci AN BSSR. Sier. hramad. naw." 1962, 2, s. 90.

[38] *Etymałahiczny słounik biełaruskaj mowy*, t. 6, red. H. A. Cychun, Minsk: Biełaruskaja nawuka, 1990, s. 223.

[39] *Słounik haworak centralnych rajonau Biełarusi*, s. 225.

[40] I. R. Szkraba, *Samabytnaje słowa: Słounik biełaruskaj biezekwiwalentnaj leksiki* (*u ruskamounym daczynienni*), Minsk 1994, s. 111.

[41] *Ruska-biełaruski słounik*, red. J. Kołas, K. Krapiwa, P. Hlebka, Maskwa: Dziarżaunaje wydawiectwa zamieżnych i nacyjanalnych słounikau, 1953.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 02/11/2026 15:06:37

рыстоўваецца пры тлумачэнні значэння слова **ліквідатар** у прыкладзе, што ілюструе ўжыванне гэтага слова ў мове: „*Ліквідатар. Той, хто займаецца ліквідацыяй чаго-н. Л.* ***наступстваў*** *аварыі на Чарнобыльскай АЭС*”. Фіксуецца СБМ, ГСН, БРС, але адсутнічае ў РБС.

ПЛЯЦА́К, -а́, *м.* (польск. plecak). Рукзак. *Задарма ўжо не падбяруць, не падвязуць. Тым больш з грувасткімі* ***плецакамі***. – ЛіМ 1999, № 39, с. 5. Фіксуецца толькі РБС: *рюкзак – заплечнік, пляцак, рукзак*; адсутнічае ў СБМ, ГСН і БРС. Слова прадстаўлена таксама ў *Слоўніку безэквівалентнай лексікі* з паметай *абл.*[42].

СЛУ́ХАЎКА, -і, *ж.* (польск. słuchawka, укр. слухавка). Тэлефонная трубка. *Хвіліна чакання – і вось на тым канцы тэлефоннага дроту, за тысячу кіламетраў ад Белавежы,* ***слухаўку*** *зняў Гарбачоў.* – ЛіМ 1993, № 38, с. 5. *Вераніка пакутліва падымала* ***слухаўку*** *тэлефона.* – „Маладосць” 1998, № 5, с. 153. У Стан-92 зафіксавана слова **слухалка** – *слуховая трубка*. Фіксуецца толькі СНС.

СПАРТО́ВЕЦ, -о́ўца, *м.* (польск. sportowiec). Спартсмен. *Права падбіраць сабе каманды мелі нашы самыя лепшыя* ***спартоўцы***. – ЛіМ 1997, № 41, с. 14. ***Спартоўцы*** *спаборнічаюць на стадыёнах.* – ЛіМ 1998, № 8, с. 2. Фіксуецца толькі СНС (як і прыметнік **спартовы** [польск. sportowy]).

СТАСУ́НКІ, -аў, *толькі мн.* (польск. stosunek). Адносіны, сувязь, зносіны. *У Расіі з Балтыяй больш цывілізаваныя* ***стасункі****, чым з краінамі СНД.* – ЛіМ 1996, № 34, с. 2. *...Так пазначыць у лістах да Марыі Канстанцінаўны Хайноўскай свае* ***стасункі*** *з Уладзіславай Францаўнай Канстанцыя Буйло.* – „Полымя” 1996, № 5, с. 278. Упершыню слова **стасунак** было зафіксавана ў БНТ–1; фіксуецца БРС–26 і РБС–28. Але адносіны да гэтага слова не былі адназначнымі. Так, Антон Адамовіч пісаў у часопісе „Узвышша”: „Слова *стасунак*, якое часам ужываецца для перадачы *дачыненьня*, апрача таго, што крышку чужавата сваёю формаю (суфікс *-унак*) нашай мове, больш надаецца для перадачы расійскага *соотношение* (мяркуючы на прэфікс *с-*), бо магчымае ўтварэньне ад *дачыненьне – судачыненьне* крыху няпрыгожа”[43]. Фіксуецца СБМ, ГСН і РБС (*отношение* – 3. [общение, связи] *адносіны*, *стасункі*), але не прадстаўлена ў БРС.

СТРАЙК, -у, *м.* (польск. strajk, ад ням. Streik). Забастоўка, стачка. *Рашэнне аб агульнанацыянальным* ***страйку*** *застаецца ў сіле.* – ЛіМ 1993, № 51, с. 2. ***Страйк*** *пілотаў і вымушаная затрымка рэйса выпадкова зводзяць у адным месцы, у адзін час двух не вельмі шчаслівых людзей.* – „Звязда” 2005, 16 снежня. У БРС–26, РБС–28 зафіксавана лексема **штрайк**. Лексема **страйк**, як і **страйкаваць** (польск. strajkować), **страйкавец** (польск. strajkowiec), **страйкавы** (польск. strajkowy), фіксуецца толькі СНС.

[42] I. R. Szkraba, *Samabytnaje słowa…,* s. 143.

[43] A. Adamowicz, *Wykinuć niedarecznyja „adnosnyja” słowy*, „Uzwyszsza” 1929, 1, s. 115.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 02/11/2026 15:06:37

УЛЁТКА, -і, *ж.* (польск. ulotka). Лістоўка. *Помніш распаўсюджаныя напярэдадні рэферэндуму* ***ўлёткі*** *з падказкамі, як трэба галасаваць.* – ЛіМ 1998, № 30, с. 5. *Прыйшоў да нас чалавек, прадпрымальнік, якому проста надакучыла адчуваць сябе чужынцам на гэтай зямлі, і прапанаваў: а давайце зробім месячнік „Гаворым па-беларуску”. І ў дадатак праспансіраваў выпуск* ***улётак****.* – „Звязда” 2002, 19 лістапада. Фіксуецца ГСН, адсутнічае ў СБМ, БРС, РБС.

ФУНДА́ТАР, -а, *м.* (польск. fundator). Той, хто засноўвае што-небудзь, дае грошы на заснаванне, фінансуе якое-небудзь мерапрыемства; спонсар. *Пятро пераканаў аднавяскоўцаў, што такі манумент неабходны, а чакаць чыёйсьці дапамогі сёння марна. Ён сам распрацаваў ідэю і знайшоў* ***фундатараў****.* – „Звязда” 2003, 26 сакавіка. *Эрлі дадаў: „Іран з’яўляецца дзяржавай –* ***фундатарам*** *тэрору, ён займаўся акцыямі, якія мы лічым варожымі і шкоднымі, і мы разглядаем такі продаж зброі ў гэтым кантэксце”.* – „Настаўніцкая газета” 2005, 10 снежня. Лексема зафіксавана ў БРС–26 (*фундатар – основатель, вкладчик*) і РБС–28. Прадстаўлена ў СБМ, ГСН і РБС (*спонсор – спонсар, фундатар*), але адсутнічае ў БРС.

ШАРАГО́ВЕЦ, -о́ўца, *м.* (польск. szeregowiec – радавы). Той, хто нічым не вызначаецца сярод іншых; не належыць да каманднага саставу ці кіраўніцкага апарату; радавы, просты, звычайны. *У барацьбе, якую вядзе народ, я не рота і не ўзвод,* ***шараговец****…* – ЛіМ 1996, № 26, с. 16. *Ну а* ***„шарагоўцы”*** *сцэны, асабліва ў абласных тэатрах, здабываюць свой кавалак чорнага хлеба ў штодзённай працы.* – ЛіМ 1996, № 17, с. 14. У РБС–28: *рядовой* – сущ. *радавы, шаранговы, чарговы*. Фіксуецца толькі СНС, як і прыметнік **шараговы** (польск. szeregowy).

Параўнаем таксама: *візітоўка* (польск. wizytówka) – візітка (СНС; СБМ, ГСН); *вінаваўца* (польск. winowajca) – віноўнік (СНС); *выразніць* (польск. wyróżnić – вылучыць, адрозніць) – выдзеліць (СНС); *выслоўіць* (польск. wysłowić) – выразіць, паказаць (СНС); *вычэкваць* (польск. wyczekiwać) – чакаць; падпільноўваць (СНС); *даўца* (польск. dawca) – той, хто аддае, ахвяруе, дарыць каму-небудзь што-небудзь (СНС); *збаўчы* (польск. zbawczy) – збавіцельны (СНС; СБМ); *імпартовы* (польск. importowy) – імпартны (СНС); *канцэртовы* (польск. koncertowy) – канцэртны (СНС); *літарацкі* (польск. literacki) – літаратурны (СНС); *матура* (польск. matura) – экзамен на атэстат сталасці; атэстат сталасці (СНС); *незраўнаны* (польск. niezrównany) – непаўторны, непараўнальны, выдатны (СНС); *непадлеглы* (польск. niepodległy) – незалежны (СНС); *падставовы* (польск. podstawowy) – асноўны, галоўны (СНС); *пакрыёма* (польск. po kryjomu) – скрытна, употай, тайком (СНС); *размоўца* (польск. rozmowca) – суразмоўнік (СНС); *святовы* (польск. światowy) – свецкі (СНС); *уладца* (польск. władca) – уладар (СНС); *уцале* (польск. wcale) – зусім, цалкам (СНС) і інш.

Такім чынам, назіранні паказваюць, што некаторыя шырокаўжывальныя паланізмы пачынаюць фіксавацца нарматыўнымі слоўнікамі. Пры гэтым найбольш яны прадстаўлены ў СБМ і ГСН, менш – у перакладных слоўніках (гл. табліцу). Большая ж частка паланізмаў прадстаўлена выключна ў СНС.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 02/11/2026 15:06:37

Лексема	**СБМ**	**ГСН**	**БРС**	**РБС**
амбасада	+	+	+	+
амбасадар	+	+	+	+
адсотак	+	–	+	+
візітоўка	+	+	–	–
выбітны	+		–	–
выбітна	+		–	–
выбітнасць	+	+	–	–
выстава	+	+	–	+
задзіночанне	+	–	–	+
збаўчы	+		–	–
імпрэза	+	+	+*	–
інстытуцыя	+	+	–	–
каляжанка	+	+	–	–
кіроўца	+	+	–	–
наклад	+	+	+	+
напой	+	+	–	+
наступства	+	+	+	–
пляцак	–	–	–	+
стасункі	+	+	–	+
улётка	–	+	–	–
фундатар	+	+	–	+

** Як адпаведнік рус. импреза.*

Нельга не адзначыць і той факт, што „паралельна ў беларускай мове актывізуецца ў якасці нейтральнай запазычаная лексіка польскага паходжання, засведчаная ў слоўніках з рознымі абмежавальнымі паметамі (уст., разм., абл., кніжн.): *вайсковец, вакацыі, высілкі, гарбата, імбрычак, кавярня, метода, паганства* ‘язычніцтва’, *паходня, рондаль, службовец, тастамент, ходнік, чыннасць, чыннік…*”[44]. Трэба дадаць, што ў апошніх слоўніках многія з гэтых і падобных лексем прадстаўлены без памет. Хаця тут неабходна ўлічваць той факт, што ў СБМ і ГСН такія паметы ўвогуле адсутнічаюць. У ГСН, у прыватнасці, сказана, што „стылістычныя паметы ў слоўніку не падаюцца, хаця лексічны склад слоўніка неаднародны”[45]. З іншага боку, у СБМ адзначаецца: „З рэестра слоўніка выключаны некаторыя ўстарэлыя і дыялектныя лексічныя адзінкі, а таксама выразныя русізмы”[46].

Цікава таксама параўнаць, як прадстаўлена разгледжаная лексіка ў перакладных польска-беларускіх і беларуска-польскіх слоўніках. У 2012 г. кафедрай беларусістыкі Варшаўскага ўніверсітэта быў падрыхтаваны *Беларуска-польскі*

[44] H. Arciamionak, *op. cit.*, s. 148.
[45] *Hramatyczny słounik nazounika,* s. 4.
[46] *Słounik biełaruskaj mowy,* s. 3.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 02/11/2026 15:06:37

слоўнік[47] *(далей – БПС), я*кі змяшчае „больш за 40 тысяч слоўнікавых артыкулаў, сярод якіх значнае месца займае сучасная лексіка, што адлюстроўвае змены ў лексічнай сістэме беларускай мовы"[48]. Звяртае ўвагу, што ў слоўніку разглядаемыя лексемы фактычна адсутнічаюць, хаця часткова яны прадстаўлены ў *Польска-беларускім слоўніку* (2005)[49], з якім аўтары БПС былі знаёмы (ён згадваецца ў прадмове да слоўніка), а таксама зафіксаваны ў СНС: *адсотак, амбасада, выстава, закладнік, імпрэза, кіроўца, наведнік, наклад, стасункі, страйк, улётка, філіжанка* і інш. У БПС зафіксаваны толькі адзінкавыя прыклады такіх лексем, у прыватнасці: *каментар* (польск. komentarz; у адным артыкуле з *каментарый*). Такім чынам, аўтары БПС разглядаюць падобныя лексемы менавіта як польскія і не фіксуюць іх у беларускай частцы слоўніка.

З іншага боку, у БПС зафіксавана некалькі лексем, якія, верагодней за ўсё, узніклі пад уплывам польскіх адпаведнікаў (розных па паходжанні) і не фіксуюцца беларускімі слоўнікамі (або фіксуюцца толькі асобнымі з іх): бел. *беатыфікацыя* – пол. beatyfikacja; *катэхізатар* – katecheta (рэлігійныя тэрміны; лексема *беатыфікацыя* зафіксавана ў *Слоўніку сучаснай беларускай мовы* пад рэд. М. Р. Прыгодзіча, У. М. Завальнюка[50]); *інтэрвізія* – interwizja (варыянт лексемы *інтэрбачанне*).

Такім чынам, звычайна новыя і актуалізаваныя запазычанні з польскай мовы з'яўляюцца дублетамі нарматыўных беларускіх лексем. Нягледзячы на неадназначнае стаўленне да іх носьбітаў беларускай мовы і лінгвістаў, яны пачынаюць фіксавацца нарматыўнымі аднамоўнымі і перакладнымі лексікаграфічнымі выданнямі. У далейшым частка з іх можа замацавацца ў беларускай літаратурнай мове пры ўмове семантычнай або стылістычнай дыферэнцыяцыі адносна сваіх дублетаў ці ў выпадку „выцяснення" нарматыўнай лексемы. Некаторыя лексемы могуць зноў перайсці ў пасіўны запас, як гэта адбывалася ўжо ў 30-я гады XX ст.

Бібліяграфія

Adamowicz Anton, *Wykinuć niedarecznyja „adnosnyja" słowy*, „Uzwyszsza" 1929, 1.

Arciamionak Hienadź, *Biełaruska-polskaje leksicznaje uzajemadziejannie na suczasnym etapie*, [u:] *Biełaruskaja mowa: szlachi razwiccia, kantakty, pierspiektywy*: Materyjały III

[47] *Słownik białorusko-polski*, Uniwersytet Warszawski, Katedra Białorutenistyki, red. T. Chylak-Schroeder, J. Głuszkowska-Babicka, T. Jasińska-Socha / *Biełaruska-polski słounik*, red. T. Chylak-Szredar, J. Hłuszkouskaja-Babickaja, T. Jasińskaja-Socha, Warszawa: Warszauski Uniwiersitet, kafiedra biełarusistyki, 2012.

[48] *Słownik białorusko-polski*, s. 9.

[49] J. W. Wołkawa, W. L. Awiława, *Polska-biełaruski słounik:* zwysz 40000 słou, red. H. A. Cychun, 2 wyd., Minsk 2005.

[50] U. M. Zawalniuk, M. R. Pryhodzicz, W. K. Ramancewicz, *Słounik suczasnaj biełaruskaj mowy*, red. M. R. Pryhodzicz, U. M. Zawalniuk, Minsk: Narodnaja aswieta, 2009.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 02/11/2026 15:06:37

Miżnar. kanhresa biełarusistau, Biełarusika / Albaruthenica, kn. 19, red. H. Cychun i insz., Minsk: „Biełaruski knihazbor", 2001

Bachańkou Arciem Jafimawicz, *Razwiccio leksiki biełaruskaj litaraturnaj mowy u sawiecki pieryjad: sacyjalinhwistyczny narys*, Minsk: Akademija Nawuk Biełaruskaj SSR, Instytut mowaznaustwa imia Jakuba Kołasa, Nawuka i technika, 1982.

Bachańkou Arciem Jafimawicz, **Wiesztart Halina Fieliksaun, Pryszczepczyk Anna Michajłauna**, *Ci hłyboka dumau recenzient?*, „Połymia" 1987, 12.

Bajkou Mikoła, Niekraszewicz Ściapan, *Biełaruska-rasijski słounik*, Miensk: Dziarżaunaje wydawiectwa Biełarusi, 1926.

Bajkou Mikoła, Niekraszewicz Ściapan, *Rasijska-biełaruski słounik*, Miensk: Dziarżaunaje wydawiectwa Biełarusi, 1928.

***Biełaruskaja mowa**: Najnowsze dzieje języków słowiańskich*, red. Alaksandr. Lukašanec, Mikałaj Prigodzič, Lidzija Sjameška, Opole 1998.

Biełaruska-ruski słounik, u 3 t. (Bolsz za 110.000 słou), red. Alaksandr Alaksandrawicz Łukaszaniec, 4 wyd., pieraprac. i dap., Minsk: NAN Biełarusi, In-t mowy i litaratury imia Jakuba Kołasa i Janki Kupały, 2012.

***Biełaruskaja nawukowaja terminolohija**,* wyp. 1. *Elementarnaja matematyka*, Miensk: Inbiełkult, 1922.

Bułachau Michaił Hapiejewicz, *Razwiccio biełaruskaj litaraturnaj mowy u XIX–XX stst. wa uzajemaadnosinach z inszymi sławianskimi mowami*, Minsk: AN BSSR, Biełarus. kam. sławistau, 1958.

Burłyka Iwan, Daniłowicz Mikałaj, Pamiećka Nina, Sciacko Pawieł, *Ci niama u artykule Pauła Szuby biełarusafobstwa?*, „Rodnaje słowa" 1997, 12.

Etymałahiczny słounik biełaruskaj mowy, t. 6, red. Hienadź Apanasawicz Cychun, Minsk: Biełaruskaja nawuka, 1990.

Hiermanowicz Iwan Klimawicz, *Pałanizny u biełaruskaj litaraturnaj mowie 20 – pierszaj paławinie 30-ch hadou XX stahoddzia*, „Wiesci AN BSSR. Sier. hramad. naw." 1962, 2.

Hramatyczny słounik nazounika, red. Walancina Paułauna Rusak, 2 wyd., daprac., Minsk: NAN Biełarusi, Centr dasled. biełarus. kultury, mowy i lit., „In-t mowy i lit. imia J. Kołasa i J. Kupały", 2013.

Kacapau Leanid, *Wystauka – słowa na cwiordym hruncie*, „Nastaunickaja hazieta" 2002, 5 studz.

Kandracienia Iryna Uładzmirauna, *Nulawaja sufiksacyja u sistemie suczasnaha biełaruskaha słowautwarennia*, [u:] *Biełaruskajaя mowa u druhoj pałowie XX stahoddzia*, Materyjały Miżnar. nawuk. kanf. (Minsk, 22–24 kastr. 1997 g.), red. Mikałaj Ryhorawicz Prygodzicz, Minsk: Biełdziarżuniwiersitet, 1998.

Kandracienia Iryna Uładzmirauna, *Nulsufiksalnyja nazouniki wa uschodniesławianskich i polskaj mowach*, [u:] *Biełaruskaja i ruskaja mowa u Biełarusi: Prablemy funkcyjanawannia i uzajemadziejannia*. Tez. dakł. nawuk. kanf., pryswiecz. 20-hoddziu addz. biełsrus.-rus. moun. suwiaziej (siektara ruskaj mowy), red. Alaksandr Alaksandrawicz Łukaszaniec, Minsk: NAN Biełarusi, In-t mowaznaustwa, 1997.

Kapyłou Ihar Leanidawicz, **Koszczanka UładzimirAlaksandrawicz**, *Korpus tekstau jak asnowa aptymizacyi padrychtouki fundamientalnaha „Tłumaczalnaha słounika biełaruskaj*

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 02/11/2026 15:06:37

mowy”, [u:] *Kompjutiernaja lingwistika: naucznoje naprawlenije i uczebnaja discyplina*: sb. naucz. statiej, wyp. 1, ried. W. I. Kowal, Gomiel: Gomielskij Gosudarstwiennyj Uniwiersitit im. F. Skoriny, 2010.

Kaurus Aleś Alaksandrawicz, *Da swajho słowa*, „Połymia” 1995, 5.

Krukouski Mikałaj Ihnatawicz, *Ruski leksiczny upływ na suczasnuju biełaruskuju litaraturnuju mowu*, Minsk: Wydawiectwa AN Biełaruskaj SSR, 1958.

Lepieszau Iwan Jakaulewicz, *Nowyja słowy aposznich hadou*, „Rodnaje słowa” 1999, 2.

Łukaszaniec Alaksandrawicz , *Miżsławianskaje mounaje uzajemadziejannie i dynamika litaraturnaj normy* (*biełaruskaja mowa pamiż ruskaj i polskaj*), [u:] *Idem*, *Biełaruskaja mowa u XXI stahoddzi: razwiccio sistemy i prablemy funkcyjanawannia,* Minsk: Biełaruskaja nawuka, 2014.

Łukaszaniec Alaksandr Alaksandrawicz, *Prablemy suczasnaha biełaruskaha słowautwarennia*, Minsk: Biełaruskaja nawuka, 2013.

Łukaszaniec Alaksandr Alaksandrawicz, *Aktyunyja pracesy u suczasnym biełaruskim słowautwarenni*, [u:] *Biełaruskaja mowa u druhoj pałowie XX stahoddzia:* Materyjały Miżnar. nawuk. kanf., Minsk: Biełaruski dziarżauny uniwiersuitet, 1998.

Leksikałohija suczasnaj biełaruskaj litaraturnaj mowy, red. Jafimawicz Bachańkou, Minsk: Nawuka i technika, 1994.

Romaniuk Luba, *Da historyi polska-biełaruskich leksicznych uzajemasuwiaziej*, [u:] *Nawukowy zbornik*, 2, Biełastok: Biełaruskaje hramadska-kulturnaje tawarystwa, 1964.

Russko-biełorusskij słowar’/ Ruska-biełaruski słounik, 3 t., red. Aleksandr Alaksandrawicz Łukaszaniec, izd. 10, pierierab. i dop., Minsk: NAN Biełarusi, In-t jazyka i litieratury im. Jakuba Kołasa i Janki Kupały, 2012.

Ruska-biełaruski słounik, red. Jakub Kołas, Kandrat Krapiwa, Piatro Hlebka, Minsk: Dziarżaunaje wydawiectwa zamieżnych i nacyjanalnych słounikau, 1953.

Padłużny Alaksandr Iosipawicz, *Mowa: suczasnaść i buduczynia*, „Biełaruskaja dumka” 2006, 10.

Padłużny Alaksandr Iosifawicz, *Ненарматыўная лексіка ў тэрміналогіі і перыядычным друку,* [w:] *Перспектывы развіцця і функцыянавання нарматыўнай лексікі*: Арт. і матэрыялы міжнар. навук.-метад. канф., 22–23 маја *1998* g., Homel: Homiel. dziarż. un-t imia F. Skoryny, 1998.

Sadouski Piotra, *Czas odumu. Da wychadu 5-tomnaha Tłumaczalnaha słounika biełaruskaj мовы*, „Połymia” 1986, 5.

Sciacko Pawieł Uładzimirawicz, *Prablemy normy, kultury mowy:* nawucz. dapam., Hrodna: Hrodzienski dziarżauny uniwiersitet imia J. Kupały, 1998.

Sciacko Pawieł Uładzimirawicz, *Prablemy leksicznaha narmawannia biełaruskaj mowy:* nawucz. dapam., Hrodna: Hrodzienski dziarżauny uniwiersitet imia J. Kupały, 1999.

Sciacko Pawieł Uładzimirawicz, *Pra wystawu i smietankowaje masła*, „Rodnaje słowa” 1992, 6.

Sciacko Pawieł Uładzimirawicz , *Wystawa… Naturalnaje u biełaruskaj mowie słowa*, „Rodnaje słowa” 1994, 1.

Sciacko Pawieł, *Ci niama u artykule Pauła Szuby biełarusafobstwa?*, „Rodnaje słowa” 1997, 12.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 02/11/2026 15:06:37

Słounik biełaruskaj mowy, red. Alaksandr Alaksandrawicz Łukaszaniec, Walancina Paułauna Rusak, Minsk: NAN Biełarusi, In-t mowy i lit. imia Jakuba Kołasa i Janki Kupały, 2012.

Słounik haworak centralnych rajonau Biełarusi [u 2 t.], red. Jeudakija Sciapanauna Miacielskaja, Minsk: Uniwiersiteckaje, 1990.

Słounik biełaruskich haworak paunoczna-zachodniaj Biełarusi i jaje pahraniczcza, t. 2, red. Józefa Fłaryjanauna Mackiewicz, Minsk: Nawuka i technika, 1980.

Słounik haworak centralnych rajonau Biełarusi, [u 2 t.], t. 1, red. J. S. Miacielskaja, Minsk: Uniwiersiteckaje, 1990.

Słownik białorusko-polski, red. Teresa Chylak-Schroeder, Jadwiga Głuszkowska-Babicka, Teresa Jasińska-Socha / *Biełaruska-polski słounik*, red. T. Chylak-Szredar, J. Hłuszkouskaja-Babickaja, T. Jasińskaja-Socha, Warszawa: Uniwersytet Warszawski, Katedra Białorutenistyki, 2012.

Stankiewicz Janka, *Biełaruska-rasijski (Wialikalitouska-rasijski) słounik* / *Byelorussian-Russian* (*Greatlitvan-Russian*) *Dictionary*, New York: Published by: Lew Sapieha Greatlitvan (Byelorussian) Foundation, 1992.

Szakun Lew Michajławicz, *„Uschodnija" i „zachodnija" krynicy papauniennia leksicznych srodkau biełaruskaj mowy*, „Wiesnik Biet. dziarż. un-ta. Sier. 4, Fiłałohija. Żurnalistyka. Piedahohika. Psichałohija" 1995, 2.

Szkraba Iryna Ryhorauna, *Samabytnaje słowa: Słounik biełaruskaj biezekwiwalentnaj leksiki (u ruskamounym daczynienni)*, Minsk 1994.

Szkraba Iryna Ryhorauna, *Waryjantnaść u sfiery inawacyj*, [u:] *Jazyk i socyum*: Matieriały IV Mieżdunar. naucz. konf, 1–2 diek. 2000 g, w 2 cz., cz. 2, Minsk: Biełorusskij gosudarstwiennyj uniwiersitiet, 2001.

Szuba Pawieł Pawławicz, *Polski upływu na mowu biełaruskich srodkau masawaj infarmacyi*, „Rodnaje słowa" 1997, 10.

Tłumaczalny słounik biełaruskaj litaraturnaj mowy, red. Michaił Ramanawicz Sudnik, Mikałaj Niławicz Kryuko, 2 wyd., Biełaruskaja encykłapiedyja im. Pietrusia Brouki, Minsk 1999.

Tłumaczalny słounik biełaruskaj mowy, red. Kandrata Kandratawicz Atrachowicz (Kandrat Krapiwa), u 5 t., t. 1, Bełaruskaja sawieckaja encykładedyja, Minsk 1977.

Ułasiewicz Wiktoryja Iwanauna, Dauhulewicz Natalla Mikałajeuna, *Słounik nowych słou biełaruskaj mowy*, Instytut mowy i litaratury imia Jakuba Kpłasa i Janki Kupały NAN Biełarusi, Minsk: Wydawiectwa „TetraSistems", 2009.

Wołkawa Jauhienija Witaljeuna, **Awiława Walancina Ludwikauna**, *Polska-biełaruski słounik:* zwysz 40000 słou, red. H. A. Cychun, 2 wyd., Minsk 2005.

Zawalniuk Uładzisłau Macwiejewicz, Pryhodzicz Mikałaj Ryhorawicz, Ramancewicz Walancina Karłauna, *Słounik suczasnaj biełaruskaj mowy*, red. Mikałaj Ryhorawicz. Pryhodzicz, Uładzisłau Macwiejewicz Zawalniuk, Minsk: Narodnaja aswieta, 2009.

Zaprudski Sirhiej, *Staulennie da niekatorych inawacyj biełaruskaj mowy (pawodle dadzienych sacyjalinhwistycznaha apytannia)*, „Studia Białorutenistyczne" 2008, 2, s. 303–327, [w:] http://www.bsu.by/Cache/pdf/213073.pdf.

Żurauski Arkadź Iosifawicz, *Prablemy norm biełaruskaj litaraturnaj mowy*, Minsk: AN Biełarusi. Biet. kam. sławistau, 1993.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 02/11/2026 15:06:37

Streszczenie

Artykuł został poświęcony nowej leksyce pochodzenia polskiego w języku białoruskim na początku XXI wieku. We współczesnym języku białoruskim zazwyczaj nowe zapożyczenia z języka polskiego stanowią dublety leksemów białoruskich, należących do odmiany literackiej. Zapożyczenia te, pomimo niejednoznacznego stosunku do nich użytkowników języka i lingwistów, trafiają do publikacji leksykograficznych.

Słowa kluczowe: proces leksykalny, zapożyczenie, polonizm, nowe zapożyczenie, dublet leksykalny, korpus leksykalny, słownik ortograficznym, słownik dwujęzyczny

Рэзюме

Артыкул прысвечаны новай лексіцы польскага паходжання ў беларускай мове пачатку XXI ст. і вопыту яе лексікаграфічнага апісання. Характэрным для сучаснай беларускай мовы з'яўляецца тое, што ў ёй актывізуецца працэс запазычвання лексікі з польскай мовы і праз яе пасрэдніцтва. Звычайна новыя і актуалізаваныя запазычанні з польскай мовы з'яўляюцца дублетамі нарматыўных беларускіх лексем. Нягледзячы на неадназначнае стаўленне да іх носьбітаў беларускай мовы і лінгвістаў, яны пачынаюць фіксавацца нарматыўнымі аднамоўнымі і перакладнымі лексікаграфічнымі выданнямі.

Ключавыя словы: лексічны працэс, лексема, запазычанне, паланізм, новае запазычанне, актуалізаванае запазычанне, лексічны дублет, слоўнікавы склад, слоўнік, арфаграфічны слоўнік, перакладны слоўнік

Summary

The article is devoted to new lexemes of Polish origin in the Belarusian language in the beginning of the 21st century and the experience of its lexicographic description. The process of borrowing lexemes from the Polish language and through its mediation is a characteristic feature of the modern Belarusian language which is being actualized in it. Normally, new and actualized borrowings from the Polish language are doublets of standard Belarusian lexemes. Despite the ambiguous attitude of the Belarusian language native speakers and linguists to them, they begin to be fixed in normative monolingual and bilingual dictionaries.

Key words: lexical process, lexeme, borrowing, Polonism, new borrowing, actualized borrowing, lexical doublet, vocabulary, dictionary, orthographic dictionary, bilingual dictionary